Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



# ДОЎГАЯ ДАРОГА
## ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа

11 мая ў дзень народзінаў Янкі Маўра ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі ў 16.00 адбудзецца прэзентацыя кніг «Янка Маўр. Выбранае» і «Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа» малодшай дачкі Я.Маўра, нявесткі Я.Коласа Наталлі Міцкевіч.




У першую кнігу, выдадзеную ў серыі «Беларускі кнігазбор», увайшлі аповесці Янкі Маўра «Шлях з цемры», «У краіне райскай птушкі», «Палескія рабінзоны», «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага», некалькі апавяданняў, артыкулаў, эпісталярная спадчына Я.Маўра – лісты да Якуба Коласа, Алеся Якімовіча і іншых. У дадатку прыведзены ўспаміны пра Янку Маўра і вершы, прысвечаныя беларускаму дзіцячаму пісьменніку. Некаторыя лісты і артыкулы з цыкла «Старонкі гісторыі» друкуюцца ўпершыню.

Укладальнікам кнігі стала ўнучка Янкі Маўра і Якуба Коласа – Марыя Міцкевіч, а кароткую прадмову да кнігі напісала яе дачка – Васіліна Міцкевіч.

У другую кнігу, якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда», увайшлі ўспаміны дачкі Янкі Маўра Наталлі Міцкевіч. У кнізе апісаны раней не вядомыя факты жыцця Янкі Маўра, раскрыты яго ўзаемаадносіны з роднымі, знаёмымі. Аўтарка кнігі яскрава перадае цяжкасці эвакуацыі падчас Другой сусветнай вайны, паказвае складанае становішча сям'і Янкі Маўра ў Алма-Аце. Акрамя гэтага, Наталля Міцкевіч расказвае пра сваю вучобу, работу ў Беларускім політэхнічным інстытуце, пра сям'ю і свайго свёкра – Якуба Коласа, распавядае пра сустрэчы са знакамітымі і цікавымі людзьмі.




Да прэзентацыі падрыхтавана невялікая фотавыстава з асабістага архіва сына Якуба Коласа і зяця Янкі Маўра – Міхася Міцкевіча.

Акрамя таго, падчас імпрэзы адбудзецца адкрыццё кніжна-дакументальнай выставы «Літаратурныя шляхі Якуба Коласа і Янкі Маўра», прысвечанай дзвюм асобам у нацыянальнай культуры. Супрацоўнікі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі пазнаёмяць з найбольш цікавымі дакументамі з рукапіснага фонду: рукапісамі твораў Янкі Маўра, фотаздымкамі, кнігамі Якуба Коласа з дарчымі надпісамі. Унікальныя экспанаты будуць дапоўнены асноўнымі творамі народнага пісьменніка Беларусі, уключаючы першыя творы і сучасныя перавыданні.

Творчасць Янкі Маўра ўзбагаціла дзіцячую літаратуру прыгодніцкімі і навукова-фантастычнымі творамі. Сярод самых каштоўных экспанатаў выставы – самыя першыя публікацыі: «Сын вады» (1928), «Пекла» (1929), «Палескія рабінзоны» (2-е изд., 1933), «Слёзы Тубі» (1935) і іншыя.

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі нашчадкі Янкі Маўра і Якуба Коласа, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

**Вольга ПАНАСІНА,**
**ЦНБ НАН Беларусі**

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by